збіраецца ў іх, лічыцца вылячэбнаю, асабліва ад хвароб вачэй. Не менш шанаванымі ўяўляюцца крыніцы, святыя калодзежы, вадзе якіх таксама надаюцца вылячэбныя ўласцівасці. Знаходзячыся нярэдка ў далечыні ад паселішчаў, і камяні, і крыніцы, тым не менш, прыцягваюць вялікую колькасць людзей, падтрымліваюцца ў належным выглядзе. На пэўныя рэлігійныя святы каля іх праводзяцца набажэнствы, а на працягу года ім прыносяць шматлікія ахвяры, верачы ў іх цудадзейную сілу.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 1. Зямля стаіць пасярод свету... Мн., 1996. С. 89, 227, 281—284, 412—413, 500, 526; Тое ж. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998. С. 186, 418, 496, 547; Тое ж. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999. С. 158, 177, 280, 303, 627.

*У. А. Васілевіч.*

**АХО́ЛА-ВАЛО́** Александэры (Аляксандр Пятровіч; 27.1.1900, прыход Імпілахці Выбаргскай губерні — 15.9.1997), мастак. Жыў у Санкт-Пецярбургу (1913—19), Віцебску (1919—23), Мінску (1925—30), Маскве (1930—31), Фінляндыі (у 1931—45 і з 1963), Швецыі (1945—1963). Працаваў у газетах і часопісах «Беларуская вёска», «Маладыя араты», «Звязда», «Савецкая Беларусь», «Орка», «Млот», «Чырвоная змена», «Беларускі піянер», «Беларуская работніца і сялянка», «Плуг» і інш. У творах часта звяртаўся да адлюстравання традыцыйнай культуры і абрадаў беларусаў. У 1928 паводле вынікаў 3-й Усебел. мастацкай выстаўкі атрымаў першую прэмію за 4-колерную гравюру «Дажынкі» (лінарыт; цяпер гравюра ўпрыгожвае раздзел 1920-х г. у музеі ў г. Хяменліна, Фінляндыя). У гэтым жа годзе твор «Дажынкі» быў змешчаны на вокладцы часопіса «Работніца і сялянка». У 1930 выканаў гравюру «Да знахаркі», дзе тэма жыцця сялян з Палесся падана праз сюжэт аб хворай жанчыне, якую селянін прывёз да знахаркі. Матывы нар. мастацтва і фальклору знайшлі адлюстраванне ў матывах вокладак да паэмы Я.Коласа «Новая зямля», кніг П.Труса «Ветры буйныя», М.Нікановіча «Вясновы прамень», брашурах «Чырвоная сялянская вечарына», «Прамень», дзе аўтар імкнуўся выкарыстаць найбольш эфектныя візуальныя паэтычныя і этнаграфічныя сродкі.

*Л. Дз. Налівайка.*



*Ахонаўскі народны фальклорны гурт.*

**АХО́НАЎСКІ НАРО́ДНЫ ФАЛЬКЛО́РНЫ ГУРТ** сельскага клуба Дзятлаўскага раёна. Заснаваны ў 1986, з 1996 народны. Кіраўнікі: Н.Бурак (з 1986), С.Андрукевіч (з 1999). Працуе ў аўтэнтычнай манеры, спявае а капэла. Удзельнікі гурта з'яўляюцца носьбітамі мясцовай песеннай традыцыі. У рэпертуары абрадавы і пазаабрадавы лірычны фальклор Дзятлаўшчыны: песні каляндарнага цыкла (Ой, рана, рана, куры запелі», «Да мы Юр'я сустрачаем», «Камень», «Маладая малодачка», «Пражажаем Юр'я за сяло» і інш.), сямейна-бытавыя («Выпраўляла маці сына ў салдаты», «Калі каліна не цвіла», «Рабінушка», «Ой, ты, белая бяроза», «Матуля-раднейка», «Чумачына» і інш.), а таксама жартоўныя прыпеўкі і галашэнні. Калектыў аднавіў мясцовыя абрады Юр'я і Каляды. Песні гурта ўвайшлі ў кнігу Т.Варфаламеевай «Песні беларускага Панямоння».

*А. І. Гурчанка.*

**АХО́ЎНАЯ МА́ГІЯ**, рытуальныя дзеянні; сістэма, што ўключае слоўныя формулы, асобныя прадметы і рэчывы, з дапамогай якіх чалавек імкнуўся адвесці ад сябе небяспеку (рэальную ці ўяўную) у паўсядзённым жыцці і экстрэмальных сітуацыях. Падзяляюць А.м. на апатрапейную (адганяльную, адпужвальную) і катартычную (ачышчальную). Сутнасць першай заключаецца ў тым, каб не дапусціць варожага ўздзеяння, папярэдзіць замовай, абнесці сябе рыскай, агнём, звонам металу, другой — ачысціць сябе рытуальным абмываннем, акрапленнем, абкурваннем, ужываннем ці ўстры-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ